Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна

№ 32 (541) Серада, 6 лістапада 1963 г. Цана 1 кап.




# Са святам, таварышы!

**В. І. СЦЯПАНАУ,**
прарэктар па навуковай рабоце.

Як і ўвесь савецкі народ, калектыў нашага універсітэта сустракае 46-ю гадавіну Вялікага Кастрычніка выдатнымі поспехамі. У мінулым навучальным годзе прафесарска-выкладчыцкі састаў парадаваў Радзіму і новымі даследаваннямі, і добрымі вынікамі ў падрыхтоўцы маладых спецыялістаў. Па розных галінах ведаў былі абаронены звыш сарака доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый, дыпломы аб заканчэнні БДУ атрымалі каля чатырохсот выпускнікоў, у снежні закончаць вучобу яшчэ каля 150 студэнтаў.

Выконваючы Праграму партыі, рашэнні пленумаў ЦК КПСС, выкладчыкі многае зрабілі для павышэння ўзроўню лекцый і семінарскіх заняткаў, для стварэння студэнтам неабходных умоў паспяховага авалодвання ведамі. Па-сапраўднаму масавай і дзейснай стала выхаваўчая работа партыйнай, камсамольскай і прафсаюзнай арганізацый. Іх уплыў на ўсе бакі жыцця універсітэцкай сям'і расце з кожным днём.

А сям'я ў нас вялікая. Толькі сёлета з адрывам і без адрыву ад вытворчасці на першы курс прынята 2250 чалавек. На фізічным факультэце адкрыта новае аддзяленне — радыёфізікі і электронікі. Універсітэт мае восем факультэтаў і рыхтуе спецыялістаў рознабаковага профілю. Калі ўлічыць студэнтаў — вячэрнікаў і завочнікаў, то цяпер вучобай ва універсітэце ахоплена звыш 10 чысяч чалавек. Адзін гэты прыклад ужо можа быць яркім сведчаннем таго гіганцкага зруху, які адбыўся ў культуры Беларусі за гады Савецкай улады.

Весела праходзяць студэнцкія канікулы, але не толькі аб адпачынку думалі сёлета студэнты. Сотні юнакоў і дзяўчат выдатна папрацавалі на будоўлях Уральскай вобласці, на палях Крымскай вобласці. Многія працавалі ў час летніх канікул піянерважатымі, прачыталі сотні лекцый па месцу жыхарства, зрабілі цікавыя турысцкія падарожжы. Кожны факультэт, кожны курс можа пахваліцца сваімі добрымі справамі.

Наш абавязак — адказаць на клопаты партыі і ўрада новымі поспехамі ў вучобе, у барацьбе за чалавека камуністычнага заўтра. Няхай для кожнага з нас маральны кодэкс будаўніка камунізма стане абавязковым правілам паўсядзённага жыцця!

Заўтра на дэманстрацыі ў святочнай калоне універсітэта ў адным страі пройдуць рускія, беларусы, украінцы, прадстаўнікі многіх нацыянальнасцей Савецкага Саюза, а таксама пасланцы Кубы, В'етнама, Манголіі, Польшчы і іншых краін. Ва ўсіх іх адно імкненне, адна мэта. Вялікі Кастрычнік запаліў для ўсіх народаў зару міра і шчасця. І гэта зара разгараецца ўсё ярчэй і ярчэй.

Са святам, дарагія таварышы! Новых поспехаў у вучобе і працы!

## Ідзе новы чалавек

Права адкрыць дыскусійны клуб БДУ «Ведаць, шукаць, змагацца!» і правесці першы дыспут на тэму «Якім ты ўяўляеш сабе чалавека будучыні?» камітэт камсамола БДУ прадаставіў філалагічнаму факультэту.

Часу для падрыхтоўкі было вельмі мала — толькі тыдзень. Асабліва хвалявaліся студэнты 2 курса аддзялення журналістыкі — арганізатары дыспута. Зразумела, правесці дыспут фармальна, для «птушкі» ў справаздачы нікому не хацелася!

І вось з'яўляецца не зусім звычайная аб'ява-плакат: студэнт трымае ў руках тэлеграму з лаканічнымі радкамі «25 кастрычніка 1963 г. у 19 гадзін — дыспут». Тут жа — тэма дыспута, вершы. Другакурснікі Кузьміцкі, Прыгодзіч, Пармон выбралі гэтую форму не выпадкова. Тэлеграма заўсёды прымушае чалавека прыпыніцца. Яе радкі патрабуюць рашучасці, энергіі, мабілізацыі сіл. Вось і аб'ява-тэлеграма патрабавала не праходзіць міма, прыняць гарачы ўдзел у вялікай размове аб чалавеку.

Весці дыспут студэнты папрасілі кандыдата філасофскіх навук Анатолія Дзмітрыевіча Гусева і мяне. Пасля невялікага ўступлення Анатолія Дзмітрыевіча слова ўзяла студэнтка Галя Айзенштадт. Яна гаварыла аб простых людзях, працаўніках казахстанскіх стэпаў, аб настаўніках, якія дапамаглі ёй прыйсці да вываду, што найбольш характэрнымі рысамі чалавека будучыні будуць камуністычныя адносіны да працы, цеплыня адносін да людзей, чуласць, патрабавальнасць.

Запомнілася яркае выступленне першакурсніка-журналіста Алега Краўчанкі. Ен уяўляе людзей камунізма такімі ж рознымі па сваіх густах, прывычках, характарах, як і цяпер. Алег расказаў пра свайго сябра-марака, чалавека, на першы погляд, грубаватага, але прамой і чулай душы. У сваім сябры Алег убачыў галоўныя рысы чалавека будучыні — вялікае пачуццё любві да Радзімы, камуністычныя адносіны да працы.

У разгар дыспута адна з дзяўчын абурылася: чаму аб чалавеку будучыні так многа гаворым абстрактнага. Пры камунізме ж будзе жыць наша пакаленне! Значыць, трэба гаварыць аб нас саміх, аб нашых лепшых рысах, якія будуць галоўнымі ў чалавека будучыні, і аб нашых недахопах, якія мы павінны пераадольваць.

Словы гэтай дзяўчыны, бадай, выказалі і асаблівасць гэтага дыспута: студэнты гаварылі аб будучым не па паперках, не з прачытанага, а па сваіх асабістых назіраннях, вывадах. Адчувалася вялікая адказнасць за фарміраванне чалавека камуністычнага заўтра, імкненне да канца зразумець, што патрабуецца ад кожнага ў барацьбе нашага народа за камунізм.

**Я. В. ПЕТУШКОВА,**

асістэнт кафедры дыялектычнага і гістарычнага матэрыялізма.

## Яшчэ 45 дысертацый

З кожным годам у нашым універсітэце паляпшаецца і расшыраецца падрыхтоўка навуковых кадраў. Асабліва характэрным у гэтых адносінах быў мінулы год. З кастрычніка 1962 па лістапад 1963 года ў сценах універсітэта абаронены 3 доктарскія і 42 кандыдацкія дысертацыі.

Днямі факультэцкія вучоныя саветы па абароне дысертацый уноў пачалі сваю работу. Вялікую цікавасць пры абароне выклікала даследаванне Г. А. Ліпскай на тэму: «Уплыў канцэнтрацыі і суадносін важнейшых мікраэлементаў на фарміраванне хлорапластаў і накапленне пігментаў у лістах цукровых буракоў». Напярэдадні свята Вялікага Кастрычніка паспяхова абараніла кандыдацкую дысертацыю таксама біёлаг Е. І. Тарасевіч. Тэма яе работы —«Эксперыментальныя атрыманні паліплоідных форм радзіса і вывучэнне іх біялогіі».

Радасна сустракае свята загадчык кафедры новай і навейшай гісторыі Л. М. Шнеерсон, загадчык кафедры гісторыі старажытнага свету і сярэдніх стагоддзяў Ф. М. Нячай і дэкан падрыхтоўчага факультэта І. М. Ігнаценка. Яны прадставілі да абароны доктарскія дысертацыі.

Не адстаюць ад ветэранаў універсітэта і маладыя вучоныя. В. П. Платонаў і М. М. Ткачоў вялі свае даследаванні пад кіраўніцтвам прафесара Д. А. Супруненкі. Ужо на другім годзе навучання ў аспірантуры яны завяршылі работу над кандыдацкімі дысертацыямі. Паспяхова закончылі таксама даследаванні А. П. Ігнаценка, А. І. Кажушкоў, К. С. Адзярыха.

Цяпер у нашым універсітэце працуюць 43 прафесары і дактары навук і больш двухсот кандыдатаў навук.

## Гавораць унукі чырвонагвардзейцаў

*Напярэдадні гадавіны Вялікага Кастрычніка ў трэцяй групе 1 курса біялагічнага факультэта адбыліся семінарскія заняткі па курсу гісторыі партыі.*

*Першы семінар... Бачна, таму многія студэнты так хвалявaліся. Але ж страх перад першымі выступленнямі на семінары хутка ўлёгся, а вось нейкая прыўзнятасць у адказах так і засталася да канца заняткаў. Ды і як можна нам, унукам чырвонагвардзейцаў, абыякава гаварыць аб тых, хто стварыў першыя марксісцкія гурткі ў Расіі, аб мужных рэвалюцыянерах, паклаўшых першыя цагліны ў вялікасны будынак партыі, аб правадыру камуністаў Уладзіміру Ільічу Леніну?!*

*Студэнткі С. Каховіч, А. Пяцюк, О. Качэрга расказваюць аб першым з'ездзе РСДРП, што адбыўся ў Мінску, аб барацьбе У. І. Леніна і яго прыхільнікаў супраць народнікаў, легальных марксістаў. Адчуваецца, што студэнты з вялікай цікавасцю вывучалі матэрыялы па гісторыі партыі, глыбока асэнсавалі прачытанае. Парадавалі сваімі адказамі Н. Булацкая, А. Мельнік, С. Куцік і іншыя выступаўшыя. Свае першыя поспехі ў вучобе яны прысвяцілі святу.*

Жанна ЛЯХАВА.



## На поэтической волне

### За „Бригантины“

Бьет снова скептик в грудь себя картинно,
Как древний сфинкс, величественно хмур.
А мы за бури, мы за «Бригантины»,
За дальних волн тревожную лазурь.
Вещает скептик, выцвевший и старый,
Все сжечь огнем неверия спешит.
А мы за сердца частые удары.
За огневую молодость души.
Нам плыть и плыть, упорно, неустанно.
Нам не смирять взволнованную кровь.
Нам друг лишь тот, кто видит сквозь туманы
Вершины неоткрытых островов.

Леонид ДАЙНЕКО,
студент 1 курса отд. журналистики.

### Мать

О память, память—поле минное..
И тут флажок, и там флажок,
И сверху небо вроде мирное,
А стоит в сторону шажок...
Тебя ничто уже не вылечит.
Ты отнесен взрывной волной
Туда, где кровь по капле вытечет,
В тот страшный год, сорок седьмой.
...Ровесник мой! Ты помнишь живо,
Как в голодовку лет былых
На завтрак парили крапиву,
А на обед жевали жмых,
Как в ноябре, чуть свет в окошках
С мешком на шее, в сапогах
Искали мертвую картошку
На серых вымерзших полях?!
Лишь ноги к вечеру гудели,
Сковорода картошин в пять.
Да в сторону глаза глядели,
Когда на нас смотрела мать,
Да только вздрагивали руки...
Среди невзгод, нужды, смертей
Мне тяжелей любой разрухи
Сухие слезы матерей.
Ровесник мой, ты помнишь маму,
Скажи — она жива теперь,
Иль жизнь жестокая упрямо
За ней свою закрыла дверь?
Ушла последним поворотом,
Сказав последние слова?
Нет! я скажу любому — врете,
Кто мне ответит — не жива...
Детство: и первые радости — мать!
Юность: и первые горести — мать!
Зрелость: любовь и открытия — мать!
Жизнь вплоть до смертной агонии — мать!

Ю. САПОЖКОВ.



ВОСЕНЬ

Фотаэцюд А. ГРАДЗЮШКІ, студэнта аддз. журналістыкі.

## ПАРТЫЯЙ МАБІЛІЗАВАНЫЯ

НАМ, студэнтам з Вострава Свабоды, выпаў вялікі гонар адзначыць слаўны юбілей Кастрычніка на радзіме Леніна — у Савецкім Саюзе. У гэтыя святочныя дні нам асабліва хочацца адказаць на сімпатыі, на любоў, якімі нас акружылі савецкія людзі. Хочацца расказаць, як Куба пераможным маршам ідзе па шляху сацыялізма, як яе гераічны народ ліквідоўвае цяжкія рэшткі мінулага, у прыватнасці, культурную адсталасць.

У цяперашні час рэвалюцыйная Куба — гэта велізарны універсітэт. Як заявіў Фідэль Кастра, наш народ, што дзесяцігоддзямі жыў пад уладай хлусні, цемры, толькі пасля перамогі рэвалюцыі атрымаў неабмежаваную магчымасць ліквідаваць культурную адсталасць. І гэтую магчымасць ён выкарыстоўвае добра. Дастаткова сказаць, што ўсюды функцыяніруюць курсы тэхмінімума і курсы па павышэнню кваліфікацыі. На іх займаюцца ўсе рабочыя. Зразумела, для такой вялікай колькасці слухачоў не хапае вучэбных класаў, таму заняткі звычайна праходзяць у імправізаваных аўдыторыях. Выкладаюць студэнты, служачыя, перадавыя рабочыя. Яны шмат свайго вольнага часу аддаюць таму, каб у кароткі тэрмін павысіць кваліфікацыю і ўзняць культуру шырокіх народных мас. Гэта—аснова хуткага павышэння прадукцыйнасці працы.

Шмат можна расказаць аб рабоча-сялянскіх факультэтах Хуліо Антоніо Мелья, арганізаваных у Гаванскім універсітэце, а таксама ва універсітэтах правінцый Арыентэ і Лас Вільяс. Тут перадавыя рабочыя і сяляне атрымоўваюць неабходныя веды, каб заняць вядучыя месцы ў развіцці эканомікі. Яны кампенсуюць тыя страты, што панесла наша краіна, калі многія інжынеры і тэхнікі пакінулі Кубу і паехалі разам са сваімі гаспадарамі-імперыялістамі.

Тысячы рабочых і сялян, маладых і старых, навучыліся чытаць і пісаць у час слаўнай кампаніі па барацьбе з непісьменнасцю і цяпер працягваюць павышаць свае веды.

Вялікай папулярнасцю ў краіне карыстаюцца курсы, арганізаваныя для воінаў узброеных рэвалюцыйных сіл. Тут адначасова з ведамі па ваеннай справе, неабходнымі для абароны Радзімы ад імперыялістычнай агрэсіі, кубінцы авалодваюць граматай і мірнымі прафесіямі.

Аб усім гэтым можна пісаць шмат. Людзі, якія наведваюць Кубу, заўсёды здзіўляюцца, што народ, які некалькі год назад быў амаль непісьменны, цяпер чытае столькі многа. Усюды — дома, на вуліцы, у аўтобусе — можна сустрэць простага працаўніка, які чытае кнігу або расказвае аб апошніх навінах культурнага жыцця. Народ, які да рэвалюцыі не меў доступу да культуры, сёння цікавіцца дасягненнямі ў галіне навукі і тэхнікі, у пакарэнні космасу, чытае творы класікаў і сучасных пісьменнікаў. Кубінскі народ любіць выстаўкі, канцэрты, тэатр, спорт. Ён умее культурна адпачываць, весяліцца, самааддана працаваць на ўсіх франтах сацыялістычнага будаўніцтва.

Думаю, што чытачам студэнцкай газеты універсітэта будзе цікава больш ведаць аб жыцці кубінскага студэнта, аб жыцці моладзі, якая вучыцца ва універсітэтах, інстытутах, тэхнікумах. Трэба адзначыць, што кубінскія студэнты заўсёды актыўна ўдзельнічалі ў барацьбе супраць буржуазных урадаў, якія служылі інтарэсам амерыканскага імперыялізма.

Адзіная партыя сацыялістычнай рэвалюцыі накіравала многіх юнакоў і дзяўчат на вельмі важны ўчастак вялікай будоўлі — на вучобу. Мы пастараемся добра вучыцца і стаць высокакваліфікаванымі спецыялістамі для таго, каб дапамагчы пабудове новага грамадства.

Але студэнты Кубы не толькі вучацца, яны ўжо цяпер разам з усім народам працуюць, ахоўваюць рубяжы Радзімы. Па суботах і нядзелях можна бачыць цэлыя караваны аўтамашын. Гэта студэнты едуць на ўборку цукровага трыснягу, хлопка, іншых культур. Студэнты актыўна ўдзельнічаюць у гуртках мастацкай самадзейнасці і захапляюцца спортам. Нядаўна нашы спартсмены дабіліся вялікіх поспехаў на спаборніцтвах студэнтаў свету ў Порту-Алегры. А наперадзе — новыя перамогі, новыя радасці.

Мы добра ведаем, з якой цікавасцю і сімпатыяй адносяцца савецкія студэнты да нашай краіны ўвогуле і да нас, у прыватнасці. У адным артыкуле цяжка расказаць аб усім. Але мы пастараемся гэта зрабіць у наступных. Да новых сустрэч, дарагія сябры! Са святам Кастрычніка!

Хенара Дэль РЫО,
студэнт падрыхтоўчага факультэта.

## Перамаглі гісторыкі

У парку «Перамога» адбыўся фінал асенняга лёгкаатлетычнага кросу на першынство універсітэта. На старт выйшла 600 студэнтаў.

Сярод мужчын у бегу на 3000 метраў перамог студэнт 2 курса гістарычнага факультэта Аляксандр Папоў — 8 мінут 45 секунд. Сярод жанчын перамагла студэнтка 2 курса хімічнага факультэта Ольга Філіповіч. 1000-мятровую дыстанцыю яна прабегла за 3 мінуты 19,8 секунды.

У агульнакамандным заліку перамаглі красмены гістарычнага факультэта. На другім месцы — каманда геаграфічнага факультэта, на трэцяе месца выйшлі студэнты біялагічнага факультэта.

## У добры шлях!

*У нашу вялікую універсітэцкую сям'ю ўлілося новае папаўненне будучых навуковых работнікаў, выкладчыкаў. У адрозненне ад мінулых год, сёлета прыём у аспірантуру праводзіцца ў два патокі. У першым туры паспяхова вытрымалі экзамены 47 чалавек. 34 з іх залічаны на вучобу з адрывам ад вытворчасці. З 15 па 30 снежня будуць праходзіць экзамены ў другім туры. Па плану, у гэтым годзе універсітэт павінен прыняць у аспірантуру 85 чалавек на вучобу з адрывам ад вытворчасці і 26— без адрыву.*

*І хоць прыём далёка яшчэ не завершан, можна ўжо сказаць, што папаўненне ідзе добрае. Як правіла, у аспірантуру паступаюць людзі з вялікім стажам работы, добра зарэкамендаваўшыя сябе на вытворчасці, у грамадскай дзейнасці. У некаторых таварышаў ужо ёсць навыкі навуковага даследавання, яны маюць навуковыя працы. Многія выбралі тэмы для дысертацый і працавалі ўжо над зборам і абагульненнем матэрыяла. А вось яшчэ адзін характэрны факт. З 47 прынятых у аспірантуру ў першым патоку 19 чалавек часткова або поўнасцю здалі кандыдацкія экзамены.*

*З добрымі рэкамендацыямі прыйшлі да нас інжынеры І. Станкевіч, Э. Ратнікаў, О. Кузнечык, настаўнікі В. Гайдук, Н. Батурыцкая, работнік выдавецтва В. Баркан, камсамольскі работнік І. Сяргееў і інш. Улічваючы ўзровень падрыхтоўкі і накоплены жыццёвы вопыт, можна чакаць ад новага папаўнення добрых поспехаў у вучобе.*

*Цяпер за справу, таварышы! У добры шлях!*

Н. П. ПРАТАСЕВІЧ,
загадчык аддзела аспірантуры.

## Чэмпіёнскі почырк



*Чорныя робяць ход. Магчыма, ён і прывёў партыю Плакхін — Хапалюк да нічыёй.*

Некалькі дзён назад да шашыстаў універсітэта прыйшлі ў госці рабочы радыёзавода, новы чэмпіён краіны, майстар спорту па шашках А. Плакхін, а таксама трэнер беларускіх шашыстаў М. Гелер — выпускнік універсітэта, чэмпіён БССР Ю. Файнберг, адзін з мацнейшых беларускіх шашыстаў Л. Вярцінскі.

Адна з самых вялікіх аўдыторый галоўнага корпуса была перапоўнена. Аркадзь Плакхін падзяліўся ўражаннямі аб XXIII першынстве краіны па рускіх шашках. Аб арганізацыі спаборніцтваў у Ліепае расказаў Ю. Файнберг. Весь горад, дзе праходзіў чэмпіянат, жыў шашкамі. Нават канверты, этыкеткі былі прысвечаны першынству. Глядзельная зала заўсёды была перапоўнена.

У фае трэцяга паверху Аркадзь Плакхін даў сеанс аднachасовай гульні на 50 дошках. Толькі шчаслiўчыкам давялося ўдзельнічаць у сеансе, бо заявак было аж 220! А сачылі за ходам сеанса больш чым 500 чалавек. Такой аўдыторыі не збіраў яшчэ ні адзін від спорту. Сапраўды, шашкі сталі адным з самых масавых відаў спорту ва універсітэце.

Цікава праходзіў сеанс. Гэта ўжо трэці сеанс Плакхіна ў БДУ. У першым ён упэўнена паказаў сваю перавагу, перамогшы на ўсіх дошках. У другім ён зрабіў 8 нічыіх і адну партыю прайграў. Тады сеанс праходзіў на 40 дошках.

І вось трэцяя сустрэча. Першымі, натуральна, былі пройгрышы. Але і для прайграўшых былі вызначаны жартоўныя прызы. В. Кананюк у папярэднім сеансе звёў партыю з Плакхіным унічыю, а тут першым прайграў! Было ад чаго сумаваць! Яму ўручаюць прыз: цукеркі і хусцінку (хоць і мужчына, але ж...). Прайграе кандыдат у майстры Д. Каган, і яму ўручаюць прыз — кнігу «У дапамогу пачынаючаму шашысту...»

Весела і цікава праходзіў сеанс. І хоць ніхто не перамог новага чэмпіёна, але 11 нічыіх гавораць самі за сябе. Унічыю звялі свае партыі з Плакхіным дзяўчыны Соркіна і Хапалюк, юнакі Хацкевіч, Роліч, Леў, Абрамовіч, Рупека, Берташ, Сляпкоў, Пісаронак. Усе яны ўзнагароджаны спецыяльнымі прызамі шашачнага клуба БДУ.

Генадзь ДРАБУШЭВІЧ.

Рэдактар М. ІОСЬКА.

Адрас рэдакцыі:
Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, 212. Тэл. 2-07-19.

Друкарня Белсаўпрофа.
АТ 10547. Тыр. 2000. Зак. 3990